«Вясна» — экстрэмісцкае фармаванне.
Што трэба ведаць?

Падтрымай "Вясну" на PATREON

# Вярхоўны суд пакінуў без зменаў прысуд палітвязню Троцкаму, якога асудзілі да 10 гадоў калоніі

17.06.2021 **Тэгі**: суды, палітвязні

**У Вярхоўным судзе 15 чэрвеня была разгледжаная апеляцыйная скарга на прысуд палітзняволенага 45-гадовага бізнэсоўца з Мінску Аляксандра Троцкага. 5 сакавіка Мінгарсуд асудзіў яго за наезд на супрацоўніка ДАІ як за замах на забойства супрацоўніка органаў унутраных спраў (арт. 14 арт. 362 Крымінальнага кодэкса) да 10 гадоў пазбаўлення волі ва ўмовах узмоцненага рэжыму. Суддзя Уладзімір Чаравач пакінуў скаргу палітвязня без задавальнення — у хуткім часе яго этапуюць для адбыцця пакарання ў калонію на 10 год. Сам Аляксандр на разглядзе сваёй скаргі не прысутнічаў — ні асабіста, ні праз скайп. Месяц таму яго перавялі з мінскага СІЗА №1 у магілёўскую турму №4. Жонка і сын Аляксандра змаглі сустрэцца з ім у турме на наступны дзень пасля паседжання ў Вярхоўным судзе. Родныя распавялі "Вясне", як адчувае сябе палітвязень і што яго турбуе цяпер.**




*Аляксандр Троцкі ў судзе 24 лютага. Фота: "Белсат"*

Па словах сына Аляксандра, ён адчувае сябе параўнальна нармальна. Цяпер яго ўжо не змяшчаюць у карцар, але пра прычыны ранейшых спагнанняў так нічога і невядома.

> *"Адзінае, што ён у поўным інфармацыйным вакууме. Бо "хата" маленькая, і туды не часта "заязжаюць" людзі, як гэта было на "Валадарцы", таму ён не ў курсе навінаў. Таксама ўсё сумна ў плане кніг і самаадукацыі.*
>
> *Але галоўны сум у бацькі — тое, што яму прыходзіць вельмі мала лістоў. Яму нават не дайшлі лісты ад сяброў, якія яму дакладна пісалі. Ён атрымлівае лісты вельмі рэдка".*

## Падтрымаць палітвязня можно па адрасе:
## *Турма №4, 212011, г. Магілёў, вул. Крупскай, 99А, Аляксандру Фёдаравічу Троцкаму*

# За што асудзілі Аляксандра?

Суддзя **Сяргей Хрыпач** прызнаў Аляксандра вінаватым па арт. 14 арт. 362 Крымінальнага кодэкса, вырашыў, што ў Троцкага сапраўды быў намер на забойства супрацоўніка ДАІ і пакараў яго **10 гадамі пазбаўлення волі ва ўмовах узмоцненага рэжыму.** Пракурор **Антон Цюменцаў** прасіў

пакараць Троцкага 11 гадамі калоніі. Таксама суд абавязаў Троцкага выплаціць пацярпеламу супрацоўніку ДАІ 10 тысяч рублёў маральнай і матэрыяльнай шкоды.

Нагадаем, Мінскі гарадскі суд 5 сакавіка вынес прысуд па крымінальнай справы за замах на забойства супрацоўніка органаў унутраных спраўў (арт. 14 арт. 362 Крымінальнага кодэкса) супраць 45-гадовага бізнэсмена **Аляксандра Троцкага**. Паводле абвінавачвання, ён правёз 12 жніўня на капоце сваёй машыне супрацоўніка ДАІ **Уладзіміра Юрава**, у выніку чаго той атрымаў цялесныя пашкоджанні, якія не пацягнулі за сабой кароткачасовага расстройства здароўя. Па словах Троцкага, яго машыну беспрычынна спынілі людзі ў цёмным і балаклавах, а калі той, баючыся за сваё жыццё, адмовіўся выйсці з машыны, супрацоўнік ДАІ *"дастаў баявую зброю і накіраваў у яго бок, прыцэліўся прама ў галаву",* пасля гэтага ён з'ехаў з месца.

**Пасля затрымання Троцкага моцна збілі.** З чэрапна-мазгавой траўмай пад канвоем і ў кайданках ён правёў у шпіталі тры тыдні. Затым Аляксандра Троцкага перавялі ў СІЗА-1 па крымінальнай справе за гвалт у дачыненні да міліцыянта (арт. 364 КК). Але перад перадачай справы ў пракуратуру следчыя пераквалiфікавалі абвінавачанне на больш жорсткае — замах на забойства супрацоўніка органаў унутраных спраўў.

***Падрабязнасці пра суд над Аляксандрам Троцкім мы пісалі тут:***



## За наезд на ДАІшніка пракурор просіць пакараць Аляксандра Троцкага 11 гадамі калоніі

Мінскі гарадскі суд працягвае разгляд крымінальнай справы за замах на забойства супрацоўніка органаў унутраных спраўаў (арт. 14 арт. 362 Крымінальнага кодэкса) супраць 45-гадовага бізнэсмена Аляксандра Троцкага.




## Без відэадоказаў і па намаляваных схемах АМАПаўцаў. Як судзяць за наезд на ДАІшніка мінчука, якому пагражае да 25 гадоў калоніі

"Вясна" назірае за гэтым судовым працэсам і распавядае, як адбываецца працэс, на якім чалавеку пагражае ад дзесяці да дваццаці пяці гадоў пазбаўлення волі, і як судзяць іншых за наезды на супрацоўнікаў міліцыі.




## "Супрацоўнік ДАІ дастаў баявую зброю і накіраваў у мой бок". Мінчука судзяць за замах на забойства супрацоўніка

Мінскі гарадскі суд 24 лютага пачаў разгляд крымінальнай справы за замах на забойства супрацоўніка органаў унутраных спраўваў (арт. 14 арт. 362 Крымінальнага кодэкса) супраць 45-гадовага дырэктара адной з мінскіх фірмаў Аляксандра Троцкага.

Опубликовать




## СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ

У Мінску асудзілі Алену Церашкову, двухразовую чэмпіёнку Беларусі па тэквандо, пісьменніцу і хірургіню

За ўдзел у акцыі пратэсту ў Мінску асудзілі палітзняволеную Галіну Лагацкую (дапоўнена)

У Жлобіне за тыдзень – тры суды за ўдзел у акцыях пратэсту ў 2020 годзе

"З мэтай вядзення дэструктыўнай дзейнасці". За ўдзел у акцыях пратэсту асудзілі двух братоў і жонку аднаго з іх

www.

## ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



## Працягваецца ціск у зняволенні: агляд навінаў пра палітвязняў з 23 траўня па 14 чэрвеня

## Гісторыя аднаго зварота. Як дзве жанчыны абаранілі свае правы

## "Як захаваць сябе ў час працяглага зняволення?" Адкрыты запіс падкаста "Вясна прыйдзе" ў Дзень палітвязняў Беларусі

## Беларусы на "крытай": як палітвязняў працягваюць пераследаваць у калоніях (дапоўнена)









# Спіс палітычных вязняў

## АПОШНІЯ НАВІНЫ

Пяць гадоў пазбаўлення волі ва ўмовах строгага рэжыму і вялізны штраф: прысуд праваабаронцу Леаніду Судаленку

Затрыманне, спецвытворчасць, ціск на палітвязняў: хроніка пераследу 21 чэрвеня

У Мінску асудзілі Алену Церашкову, двухразовую чэмпіёнку Беларусі па тэквандо, пісьменніцу і хірургіню

Ліквідацыя грамадскіх арганізацый, новыя затрыманні: хроніка пераследу 20 чэрвеня (дапоўнена)

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 17 чалавек палітычнымі зняволенымі

Франаку Вячорку прызначылі 20 гадоў пазбаўлення волі

Магілёўскую керамістку асудзілі на 1,5 года калоніі за перасланае

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

## Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Травень 2024

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

## Выбары*2024









## ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

Anti-Discrimination Centre Memorial

Московская Хельсинкская Группа

## СЯБРОЎСТВА

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

european platform for democratic elections
epde

AMNESTY INTERNATIONAL

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў baj.by

VOICE OF BELARUS

БЕЛАРУСКІ ХЕЛЬСІНКСКІ КАМІТЭТ

#BYSOL

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY